

ЯК ПРЫЗНАВАЛІСЯ Ў КАХАННІ КЛАСІКІ?

11

ЯКІЯ АЎТО КУПЛЯЮЦЬ БЕЛАРУСЫ?

15




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 САКАВІКА 2022 г. АЎТОРАК № 41 (29663)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БРЫЛО, міністр сельскай гаспадаркі і харчавання:**

*«У апошнія гады ўсё часцей узнімаецца пытанне выкарыстання тэхналогій дакладнага земляробства і рэсурсазберагальных тэхналогій. У Беларусі ўкараняюцца элементы сістэмы дакладнага земляробства (сістэмы паралельнага ваджэння, GPS-навігацыі, сістэмы ўліку расходу паліва). У 2021 годзе вясновая сяўба яравых збожжавых і зернебабовых культур з выкарыстаннем элементаў сістэмы дакладнага земляробства праведзена на 16 працэнтах плошчы, сяўба азімых збожжавых на зерне — на 10 працэнтах. Летась распрацавана канцэпцыя лічбавай платформы «Дакладнае земляробства», мэтай стварэння якой з'яўляецца інфармацыйнае суправаджэнне, планаванне і вядзенне гаспадарчай дзейнасці на аснове аператыўнага кіравання тэхналагічнымі працэсамі ў раслінаводстве».*




# ВЫБАР ЗРОБЛЕНЫ

### Змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю падтрымалі 82,86 % грамадзян, з тых, што прыйшлі на рэферэндум

**Папярэднія вынікі рэспубліканскага рэферэндуму падчас прэс-канферэнцыі агучыў старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Ігар КАРПЕНКА.**

— У адпаведнасці з артыкулам 121 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь, рашэнне аб змяненнях і дапаўненнях у Канстытуцыю лічыцца прынятым, калі за яго прагаласавала большасць грамадзян, унесеных у спісы для галасавання, — акцэнтаваў увагу кіраўнік Цэнтрвыбаркама. — Агульная колькасць грамадзян, унесеных у спісы ўдзельнікаў рэферэндуму, склала 6 мільёнаў 815 тысяч 667 чалавек. У галасаванні прыняло ўдзел 5 мільёнаў 359 тысяч 471 грамадзянін, або 78,63 % (гэта значыць, больш чым палова ад унесеных у спісы). Такім чынам, рэспубліканскі рэферэндум адбыўся.

За прынясце змяненняў і дапаўненняў да Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь прагаласавалі 4 мільёны 440 тысяч 813 грамадзян, што склала 82,86 % ад колькасці тых, хто прагаласаваў, або 65,16 % ад унесеных у спісы для галасавання. Супраць прынясця змяненняў і дапаўненняў прагаласавала 686 тысяч 165 удзельнікаў рэферэндуму, што складае 12,8 % ад тых, хто прагаласаваў, або 10,07 % ад унесеных у спісы для галасавання. Як паведамілі ў Цэнтральнай камісіі, канчатковыя вынікі рэферэндуму будуць падведзены 3 сакавіка.

Ігар Карпенка адзначыў, што яўка на рэферэндум была дастаткова добрай. Для параўнання ён прывёў вынікі яўкі трох мінулых рэферэндумаў, праведзеных у Беларусі. У 1995 годзе свае галасы аддалі амаль 65 % грамадзян, у 1996-м — звыш 84 %, у 2004 — больш за 90 % беларусаў.

СТАР. 2

# ВЯСНА. ХУТКА СЕЯЦЬ



Фота Віктара ДРАЧОВА.

**Нягледзячы на тое, што па начах на Палессі яшчэ нярэдкія замаразкі, механізатары адной з найлепшых гаспадарак Гомельскай вобласці — ААТ «Тураўшчына» ўжо практычна падрыхтавалі тэхніку да веснавых палявых работ. На механізаваным аддзяленні ў аграгарадку Верасніца трактарысты, зваршчыкі і слесары-зборшчыкі працуюць над тым, каб падчас сяўбы не было ніякіх збояў у рабоце.**

**Трактарыст Аляксандр БЛОЦКІ, які працуе ў гаспадарцы ўжо 26 гадоў, добра ведае, як важна, каб уся тэхніка была дагледжана і адрамантавана.**

## КОРАТКА

- **Знешні дзярждоўг Беларусі ў студзені зменшыўся на 1,6 працэнта, да $17,9 млрд.**
- Серыю паштовак з пасланнямі нашчадкам ад жанчын-ветэранаў ствараюць у Гродзенскай вобласці.
- **Дзень посткросера праходзіць 1 сакавіка ва ўсіх аддзяленнях «Белпошты».**
- У Баранавічах у двары дома адкапалі 26 снарадаў часоў вайны.
- **Адборачныя матчы чэмпіянату Еўропы паміж гандбалісткамі Беларусі і Грэцыі адменены.**

ISSN 1990 — 763X

У сезон

# КАБ УРАДЖАЙ УРАДЗІЎ

### Новыя сарты і падыходы ў агародніцтве



**Напярэдадні новага дачнага сезона размаўляем з дырэктарам РУП «Інстытут агародніцтва», кандыдатам сельскагаспадарчых навук Андрэем ЧАЙКОЎСКІМ аб новых сартах і гібрыдах агародніны айчыннай селекцыі, глабальным пацяпленні і пра тое, што сёння рэальна вырасціць на сваіх «сотках».**

СТАР. 13